УДК 81.119

# Інтэнцыянальная арганізацыя семантычнага канфлікту

Мартысюк Н. П.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Інтэнцыянальнасць як комплекс псіха-фізіялагічных з'яў ёсць спаранай з механізмамі мовы. Яна уваходзіць ва ўзровень несвядомага і таму ўтварае сэнсавы інварыянт, семантыку. Як пласт уласна моўнай часткі маўлення, у якім гэтае псіха-фізіялагічнае адлюстроўваецца, яна ўтварае ўзровень свядомага і паўстае ўжо як камунікатыўная стратэгія.

На ўзроўні калектыўнага несвядомага інтэнцыянальнасць нясе інфармацыю псіхічнага свету ўсяго грамадства, з'яўляецца прыроджанай і таму ўтварае сэнсавы інварыянт, які на ўзроўні індывідуальнага несвядомага пераламляецца праз інфармацыю псіхічнага свету пэўнага чалавека, і ўжо на ўзроўні свядомага актуалізуецца ў маўленні ў выглядзе стэрэатыпаў маўленчых паводзінаў і паўстае ў якасці ацэнкі, дадатнай ці адмоўнай.

Калі разгледзець фундаментальную для чалавечай культуры апазіцыю *мужчынскасць/жаноцкасць*, то на ўзроўні калектыўнага несвядомага жаноцкасць паўстае як знак пасіўнасці і слабасці, а мужчынскасць – як узор актыўнасці і моцы. На ўзроўні індывідуальнага несвядомага ацэнка камунікантаў будуецца на грунце вышэйазначаных стэрэатыпаў, дзе *мужчынскасць* і *жаноцкасць* разглядаюцца як генетычна наканаваныя формы паводзінаў, якія, аднак, пераламляюцца ў інфармацыйным полі пэўнага чалавека і не пераходзяць на ўзровень актуальнай усвядомленасці. Напрыклад, *адна жанчына кажа другой: “Кляменцяўна, што табе ёсць?” Кляменцяўна жалобна адказвае: “Учора ж майму Геначку надта ж балеў зуб. Я ж мусіла пазваніць яму, каб пашкадаваць жа ж. Што ж зробіш, ён хоць і мужчына, але ж чалавек*! *А ён абурыўся, не даў дагаварыць”.* Як бачым, калектыўнае несвядомае, дзе мужчынскае асацыюецца са здольнасцю пераадолець боль без слёз (*ён хоць і мужчына*) фільтруецца праз жаночае індывідуальнае несвядомае – схільнасці да суперажывання, што выяўляецца ў маўленні праз жаласлівую інтанацыйную нагружанасць і паўторам у кожным сказе часціцы *ж*, якое аніяк не ацэньваецца мужчынам (дарэчы яе сынам). Неўсвядомленыя перажыванні маці (яна не можа зразумець, чаму ёй сын нагрубіў) перайначваюць не толькі псіхічныя параметры душэўнага стану і маўлення, але і моўныя параметры маўлення (інтанацыю, падбор слоў). Узніклы такім чынам псіхалагічны дыскамфорт паміж сынам і маці пры супадзенні дадатных камунікатыўных інтэнцый можна кваліфікаваць як семантычны канфлікт.